Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 20 (49) Сэрэда 22-га чэрвеня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньн… …-нацыянальная аутаномія —Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратызм.—Барацьб… …царква.— Краевая згода. Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 меся…
„ „ „ 3 …
Заграніцу ўдвая дар…

Р… …дміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
…эдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр
„ сярод тэксту —25 гр
„ на апош. стар.—10 гр
за радок нонпарэля.

БОЖАЯ КАРА.

7-га чэрвеня ад кулі рэвальвэравай згінуў у Варшаве пасол С. С. Р. Р. сябра комінтэрну Войкаў. Забіў яго хлопец 19 гадоў Барыс Кавэрда. Забіў сярод белага дню, на вагзале, на вочах публікі і паліцыі. Стрэляў адкрыта у ўпор, пакуль хапіла набояў, ня гледзючы на адказныя стрэлы Войкава.

15-га чэрвеня адбыўся даразны суд. Барысу Кавердзе пагражала сьмерць, але гэтая кара яго мінула і яго засудзілі на бязтэрміновую катаргу. Страшная кара!

Усе газэты і вачавідцы аднагалосна сцьверджаюць, што Кавэрда, як пасьля забойства, так і падчас працэсу зяховываўся з вялікай адвагай. Ен ведаў, што яму пагражае сьмерць, але твар яго быў ясны, надхнёны. Ен улыбаўся убітай горэм матцы, прыяцелям і знаёмым. Гледзячы на седзячага на лаўцы абвінавачаных гэтага маладога хлапца, ніхто ня мог бы прызнаць у ім яшчэ так нядаўна грознага мсьціцеля, з рукі каторага згінуў адзін з найбольш актыўных і небясьпечных сяброў міжнароднай шайкі гадаў і зладзеяў, забойца нявінных дачок царскай сямьі і малалетняга калекі сына Алексея.

Як гэта стала? Гэтае пытаньня задаў сабе ўвесь сьвет. А перад усім задала яго сабе перапужаная аж да сьмерці уся комуністычная пагань. Задала яго сабе комуністычная пагань І НАШАЯ — БЕЛАРУСКАЯ... Адказ быў зараз-жа знойдзены; нехта сказаў, а увесь савет паўтарыў, што гэта зрабілі расейскія монархісты... Комуністы сказалі, што гэта зрабіла Англія праз сваіх агэнтаў.. А нашыя беларускія комуністы сказалі яшчэ выразьней: „забойца Войкова Барыс Кавэрда — агэнт д-ра Паўлюкевіча"... Суд выясьніў тое, што незразумелым было сьляпой і тоўстаскурай Эўропе і даў даказы для бальшавікоў, што ні Англія, ніхто іншы тутака зусім ня прычым. Барыс Кавэрда выразна і цьвёрда сказаў на судзе: „Я ЗАБІЎ Войкава, як агэнта комінтэрну за ўсё тое, што бальшавікі зрабілі ў Расеі... за дзесяткі мільёнаў растрэляных, замучаных, згінуўшых ад голаду... Я бачыў, што ужас бальшавіцкі ўсё пануе, што ніхто нічога ня робіць, што ТРЭБА ШТО-НЕБУДЗЬ ЗРАБІЦЬ... І я забіў Войкава... Мне сказалі, што мяне лічаць за монархіста. Не я дэмократа. Але я хачу каб у Расеі была бы якая іншая улада, абы толькі не комуністычная"..—А талянтны адвакат Нядзельскі у сваей шчырай, гарачай прамове сказаў: „Вы шукаеце супольнікаў Кавэрды? Яны ёсьць! Гэта мільён 700 тысяч растрэляных бальшавікамі! Гэта іх кроў, іх мука ўлажыла стары, ржавы рэвальвэр у рукі 19 гадавога хлопца"... Кавэрда быў веруючым хрысціянінам .. І суд Божы адбыўся. Вышэйшая Сіла натхніла Кавэрду на чын. Вышэйшая Сіла скіравала яго маладую нявопытную руку, якая ў імя справядлівасьці, за гора, кроў і мукі мільонаў людзей і патрыётаў зьнічтожыла аднаго з гадаў і забойцаў. Сіла Найвышэйшая папхнула Кавэрду на чын, за які ён заплаціў сваёй карьерай, доўгімі гадамі турмы і ледзь ня жыцьцём. Гэтая-ж Сіла дала гэтаму маладому нэрвоваму, шчупламу і ціхаму хлапцу цудоўную моц Духа, якая паражала усіх хто бачыў Кавэрду на працэсе.

Рэха стрэлу Кавэрды шырокаю, маланкай разняслося па усяму сьвету І сэрца іншых, яшчэ жывых гадаў, забойцаў і зладзеяў напоўніліся нявыразным жахам... А сэрца стогнучых, сэрца выгнаньцаў з Бацькаўшчыны, сэрца тых, каго бацькі, браты і крэўныя растрэляны і згінулі у падвалах чэка, напоўніліся надзеямі на скоры канец. Змучаныя душы набраліся новай сілы для апошняй барацьбы. Суд Божы адбываецца. Яшчэ нядаўна сталевая комуністычная партыя гіне. Згінуў паскуднаю сьмерцью главар Банды Ленін. Разьбіўся ад НЯВЫСЬВЯТЛЯНЫХ прычынаў Мясьнікоў, здох рэптоўна і без пары нябывалы у чалавецстве кат — Дзяржынскі. Памёр Свердлоў. Забіты ад рукі мсьціцяляў Урыцкі, Вароўскі, Войкаў. Гінуць мелкія гады ад рукі няулавімай, упартай, шэрай сялянскай масы. Скінуты з пьедэсталу правадыры комунізму, найбліжшыя супрацоўнікі Леніна — Троцкі і Зіноў'еў. — Мозг партыі, яе галоўка разьбілася і яе сябры ў панічным жаху перад нэмінаючым лёсам і карай душаць друг друга. Так, суд Божы, суд вышэйшай справядлівасьці. адбываецца. Цемру, якая вось здавалася абхопіць і запануе над усім сьветам, прарэзаюць грымоты і маланка. Адбываецца страшэнны суд.

І ані Англія, ані фашыстаўская Італія, ніхто іншы у гэтым не вінаваты. Высшая Справядлівасьць ўлажыла караючае аружжа у руку студэнта жыда Кенэгіссэра, швэйцарца афіцэра Конрадзі, гімназіста Кавэрды, укладае у рукі нязьлічанай сялянскай масы Вышэйшая Справядлівасьць адбудзецца і ніякая сіла не уратуе ад кары вінавайцаў — забойцаў і мучыцеляў, пайшоўшых супроціў законаў Божых і чалавечых.

Ад Цэнтральнага Камітэту.

Па выбарам у Гмінныя Рады.

Цэнтральны Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт паведамляе грамадзян. бяручых ўдзел у выбарах, што ў Палачанскай гміне Маладэчанскага павету сарганізаваны **Абвадовыя Беларускія Нацыянальныя Камітэты:**

1) Аборкаўскі—Старшыня Ст. Гарцуковіч.
Заступнік Вс. Юрэвіч.
Сэкрэт. Алексан. Стрыча.
2) Літоўскі — Александр. Дзеніс
Янка Ярмаковіч.
Янка Дзеніс.
3) Шыкуліцкі—Васіль Грыб.
Андрэй Аноп.
Нічыпар Сіняўскі.
4) Кабыльскі — Александр Шаломскі.
Павел Рудзік — з Пузэль.
Дзьмітр. Зенькевіч.
5) Кучукоўскі—Паўлюк Шафаловіч.
Міхась Стрыча.
Апанас Чапенко.

ІНСТРУКТАРЫ — на гміны Забрэскаю і Вішнеўскаю.

46) Язэп Бартош.
47) Пётра Казакевіч.
48) Алекс. Маліноўскі.
49) Антон Грыбоўскі.
50) Ільля Грыбоўскі.

на гміну Курыловіцкаю

51) Пав. Нагуй.
52) Іосіф Ракевіч.
53) Мік. Блачук.
54) Мік. Павочка.
55) Мік. Костанцяг.
56) Сідор Дорош.

павет Баранавіцкі

57) Тодар Лапатка.
58) Юльян Суднік.
59) Язэп Дзядовіч.
60) Макс. Сьвістуновіч.
61) Казім. Сасім.
62) Кастусь Іваноў.
63) Станіс. Янушкевіч.
64) Нонка Паўлючанка.
65) Уладзім. Ліцкевіч.
66) Юрка Лабко.
67) Янка Якубовіч.
68) Мікадым Кузьміч
69) Антось Ліхач.
70) Паўл. Пашкевіч.
71) Пётр Вайтовіч.
72) Мік. Абрамчык.
73) Алек. Паляк.
74) Баз. Піваварчык.
75) Вінц. Савіцкі.
76) Варф. Жодзік.
77) Юрка Шут.
78) Юрка Галабурда.
79) Янка Махахей.
80) Мік. Махахей.

Упаважняным на Слонімшчыну вызнаны п. Б. Боначкаўскі з вёскі Селявічы.

У Маладачанскам павеце у абвадовых Камітэтах адбыліся выбары выбаршчыкаў у Гмінныя Рады.

На выбарах быў прысутны галоўна упаважняны ад Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Выбарчага Камітэту п. Тодар Вярнікоўскі.

Вынікі выбараў гэтакія:

Красьнянскі абвод—14 асоб з іх: 3 палякі, 1—жыд 10 беларусаў.

Мясоцкі абвод— 13 асоб усе беларусы.

Карсавіцкі абвод— 4 асобы — беларусы.

Плебаньскі— 10 асоб усе беларусы.

Уланаўшчынскі—5 асоб з іх: 8 палякі і 2 беларусы.

Асавецкі— 11 асоб з іх. 2 палякі і 9 беларусаў.

Аляхновічанскі— 11 асоб з іх: 4 палякі і 7 беларусаў.

Граніцкі— 12 асоб з іх 1 паляк і 11 беларусаў.

М. Кашарніцкі— 7 асоб з іх: 2 палякі і 5 беларусаў.

Уша— 6 асоб з іх—усе беларусы.

Выбраныя беларусы ўсе пераважна кірунку Бел. Нац. Рады і (аж!) адзін „грамадавец".

Выборчая хроніка.

— ВЫБАРЫ У ГМІННЫЯ САМАУРАДЫ. У выбаршчыкі Валожынскае гміны прэйшоў элемэнт паважны і умяркаваны. Гэтак сама намячаецца і у Забрэскай гміне. Элемэнтаў левага кірунку ня чуваць Але пасьпешнасьць выбараў не дае магчымасьці плянова падгатоўкі да салідарнага выстаўленьня кандыдатаў і аб'еднаньня нацыянальных сіл.у.

Б-оў.

З цэлага Літоўскага раёну Палачанскай гміны большасьцю галасоў прайшлі у выбаршчыкі 24 беларусы.

У Кучукайскім раёне выбрана 13 беларусоў, а тыя каталікі, што лічаць сябе за палякаў, дык большасьці не атрымалі.

З іншых раёнаў Палачанскае гміны, хаця-ж сьпіскаў яшчэ не атрымаў, але ужо ёсьць ведама, што усюды у большасьці прайшлі беларусы.

М. П-віч.

У нашай Курылавецкай гміне у кандыдаты прходадзяць а на'т і у войты намечаюцца ўсё сябры ар'ештацыі Беларускае Нацыянальнае Рады.

Х-віч.

У Нясьвіжскім павеце выбары ідуць добра — у Сіняўцы нашых —10 у Лані—6. Аб рэшце наведамлю з Клецка.

Д-кі

Палітычны агляд.

Нарэшце Зах. Эўропа і ўвесь цывілізаваны сьвет пераканаліся у тым, каго маюць у асобе радавага ўраду ў Расеі: Гэта—

звычайная „банда" міжнарадовых катаў,

як яго акрэсьліў амэрыканскі пасланнік у Парыжу, ці

шайка гнусных, трусьлівых зладзеяў,

дрыжачых за сваю шкуру.

Калі дзесяць гадоў таму назад бальшавікі карысталіся масавым тэррорам у барацьбе з сваімі палітычнымі праціўнікамі, мардавалі сотні тысячаў нявінных ахвяраў бяз суда і сьледзтва, Заходняя Эўропа глядзела на гэта праз пальцы. Для яе важна было толькі гандляваць. А з кім гандляваць, хоць „з людоедамі", як сказаў Л. Джорж, гэта яе ня цікавіла: грошы не пахнуць. І па гэтай слабасьці нячулай мэркантыльнай Эўропы бальшавікі гралі як па клявішам. Мардавалі масамі паноў, архіярэяй, ксяндзоў, вучыцялёў, афіцэраў, інтэлігэнцыю сялян, работнікаў, старых і дзяцей, расейцаў і інастранцаў... А Эўропа глядзела і маўчала, бо-ж на тое „рэвалюцыя".

Глядзела, маўчала і „гандлявала",

Пакуль не пераканаліся, што з „культурнымі" людаедамі не магчыма гандляваць. Толькі адна Амэрыка вытрымала харэктар да канца заявіўшы, што ня хоча брудзіцца з бальшавікамі ня прызнае бальшавіцкага ўраду de jure, не дасьць яму грошаў і ня будзе „гандляваць", пакуль у Расеі не спыніцца тэррор, насільля, беззаконьня і не запануе права ўласнасьці і грамадзянскай свабоды.

І вось каб лягчэй ашукаць Захад, бяз грошаў якога ня можна падкапаваць гэты самы Захад і весьці сваю гнусную працу, маскоўскія дыктатары пачалі усім намаўляць, што радавая улада узмацнілась і не баіцца ніякай „контр-рэвалюцыі" ўнутры страны, што рэвалюцыйны пярыад тэррору мінаваў. Для гэтага чрэзвычайка была пераімянавана ў Г. П. У. (Гаспадарственае Палітычнае Упраўленьне). Гаворылася, што бяз суда і сьледзтва не бывае сьмертных караў, што Расея пад радаваю Ўладаю „аддыхае" і паволі адбудовываецца.

Што-ж пасьля гэтага азначае гэта новая гэкатомба, аб якой Г. П У. аб'явіла на увесь сьвет? Гэтыя растрэлы каля 30 нявінных ахвяраў бяз усякага суда і сьледзтва?

Толькі тое, што

бальшавіцкі рэжым пры усіх сваіх „рэформах", „эвалюцыях" і „праабразаваньнях" застаўся тым, чым быў заўсёды, г. зн. строям, заснованым на гвалце, ня прызнаючым элемэнтарных асноваў права і чалавечага сужыцьця.

Цяперашнія фактычные гаспадары Расеі—паліт-бюро і чэка. Сталін і Менжынскі (заступнікі Леніна і Дзяржынскага)—хочуць падтрымляць сваю хістаючуюся ўладу тымі самымі мэтадамі, якія далі перамогу Леніну і Дзяржынскаму дзесяць гадоў таму назад

Але гэта ім ня удасца.

Апрача таго, што Сталін і Менжынскі пазбаўлены асабістых якасьцяў Леніна і Дзяржынскага,

Расея 1927 г. іншая, чым Расея 1918 г. адносіны культурнага сьвета цяпер да іх іншыя, чым у 1918 г.

Цяпер ўвесь расейскі народ пераканаўся ў тым, што радавая улада, трымаючаяся толькі тэррорам, нічога ня можа яму даць. Гэтак сама і Эўропа пераканалася што бальшавізм апрача шкоды нічога ня можа даць. Гэта толькі крывавыя сударагі бальшавіцкага рэжыму. Растрэл 30 нявінных ахвяраў за сьмерць аднаго Войкава

выклікаў толькі пагарду усяго культурнага сьвету да радавай улады,

асабліва пасьля таго пратэсту, з якім бальшавікі выступілі ў сваіх нотах да Польшчы проці няістнуючага на тэрыторыі Польшчы „тэррору".

Калі на дзесятым годзе свайго істнаваньня радавая улада мусіць зьвяртацца да падобных мэтадаў; калі напярэдадні дзесяцігадовага юбілею у Петраградзе кідаюць бомбу на сабраньні камуністаў, робіцца замах на петраградзкага дыктатара і менскага галоўнага чэкіста; калі не спыняецца тэррорыстычная барацьба з уладаю—гэта значыць, што,

Працэс Барыса Кавэрды.

ПЕРАД ГМАХАМ СУДА.

У сераду 15 чэрвеня а 10 г. рана пачаўся працэс Барыса Кавэрды у даразным судзе у Варшаве (Мядовая вуліца). Ужо з раніцы гмах асаджаўся таўпою жадаючых пранікнуць да салі суда. Шмат было дамаў з букетамі кветак. Але прапушчана быў

БАРЫС КАВЭРДА



Выходзіць на суд з турмы на Дзельнай вуліцы.

толькі нязначны лік, галоўным чынам прадстаўнікоў прэсы, суда, адвакатуры і сьведкі. Пропускам кіраваў сам галоўны камэндант паліцыі м. Варшавы. Барыс Кавэрда быў прывезяны з турмы на Дзельнай вуліцы ў карэтцы пры моцнай паліцэйскай ахране ў 8 гадз. рана.

ЗАГРАНІЧНЫЯ КАРЭСПАНДЭНТЫ.

У салю суда зьявілася шмат карэспандэнтаў заграднічнай прэсы, як напр. „New Iork Daily News", „The Chicago Tribune", „Daily Mail" (Лёндан), „Pedeja Bihdni" (Латвія), „Сегодня" (Рыга), агэнства „Руссniрэсс", „Pager Presse" і іншыя. Апрача гэтага некалькі дзесяткаў прадстаўнікоў польскай, сталічнай і правінцыяльнай прэсы. Пад канец паседжаньня зьявіліся ў салю нават карэспандэнты бальшавіцкіх газэтаў і агэнства „Тасс".

Сярод прысутнай публікі можна было заўважыць шмат сябраў апэляцыйнай пракуратуры, судзьдзяў усіх інстанцыяў, дахтароў-псыхіятраў, шмат адвакатаў, асабліва па ўгалоўным справам.

СЬВЕДКІ.

Было запрошана да суда 22 сьведкі, ў ліку якіх былі бацька, маці і сястра Б. Кавэрды, старшыня Бел. Нац. Рады А Паўлюкевіч, Друцкі-Падбярэскі, Іўжынка, дырэктар віленскай расейскай гімназіі Белеўскі і выгнаны з Лёндану радавы прадстаўнік Розэнгольц, якога спатыкаў Войкаў на вагзале ў трагічную хвілю. Але Розэнгольц прыехаў з Масквы толькі а 7 г. і зьявіўся ў салі суда а 9 г. вечара.

СКЛАД СУДА І АБАРОНЫ.

Старшыня суда — Гумінскі, судзьдзі — Казакоўскі і Скавенскі. Абвінавачываў — пракурор апэляцыйнага суда Рудніцкі. Баранілі — варшаўскія адвакаты—Нядзельскі, Пасхальскі і Эццінгэр і віленскі — Андрэяў, усе без ганарару.

ПАДСУДНЫ Ў САЛІ СУДА.

У 10 г. 25 м. ў саправаждзеньні двох паліцэйскіх вайшоў Б. Кавэрда. Трымаўся спакойна. Прывітаўся з адвакатамі. Адвакат Андрэяў пашлёпаў яго па плячу.

У 10 г. 45 м. вайшоў да салі суд. На запытаньне Старшыні суда, якога ён грамадзянства, Б. Кавэрда адказаў, што ня ведае. Праваслаўны, радзіўся 21 серпеня 1907 г. кончыў 7 кл. гімназіі, працаваў у „Беларускім Слове".

АКТ АБВІНАВАЧАНЬНЯ.

У дню 9 чэрвеня а 9 г. раніцай прыбыў на вагзал радавы пасланнік Войкаў і спаткаўся там з радавым пасланнікам у Лёндане Розэнгольцам. Калі яны выйшлі з жал.-дарожнага рэстарану на пэрон, падбег нейкі малады хлапец і пачаў страляць. Войкаў пачаў уцякаць, а пасьля, трапляны куляю, затрымаўся і пачаў адстрэлівацца, нарэшце ўпаў на зямлю цяжка ранены. Забойца Войкава Кавэрда падняў рэвальвэр над галавою і аддаўся ў рукі паліцыі. Тлумачыць свой учынак помстаю за Расею.

ПЕРШАЕ ПАКАЗАНЬНЕ Б. КАВЭРДЫ.

На пытаньне Старшыні суда, ці прызнае сябе віноўным, Б. Кавэрда адказаў.

Прызнаюся, што забіў Войкава, але ня лічу сябе вінаватым. Гуляў на пэроне. Забачыў Войкава, падыйшоў і выстрэліў. Забіў Войкава за ўсё тое, што бальшавікі зрабілі у Расеі. Гаварыў Б Кавэрда коратка і рашуча. У салі мёртвая цішыня.

ПАКАЗАНЬНІ СЬВЕДКАУ.

Самае моцнае ўражаньне на ўсіх прысутных у салі суда зрабілі паказаньні маткі Б. Кавэрды. Яна адзывалася аб сыне, як аб добрым, дэлікатным хлопчыку, які горача любіў усю сямью і забоціўся аб ей і сёстрах, як бацька Пасьля вазвращчэньня з Расеі ў 1920 г., куды эвакуіраваліся ў часе вайны, уся семья жыла ў вялікай беднасьці. Адзінай апораю і падтрыманьнем сям'і быў Барыс. Заробак яго часамі не перавышаў 50 — 60 зл. у месяц, якія поўнасьцью аддаваў матцы. Быў вельмі рэлігійны і ня мог забыць і даравацць бальшавікам тое, што яны зьдзекаюцца над рэлігіяй і з цэркваў зрабілі кінаматаграфы і танц клясы. На Барыса зрабілі вельмі моцнае ўражаньне тыя зьверствы бальшавікоў, сьведкай якіх быў у Расеі.

Старшыня Бел Нац. Рады А. Паўлюкевіч паказаў, што знаў Барыса тры гады Гэта быў чэсны, панятлівы і працавіты хлапец. Толькі вельмі уражлівы. Цікавіўся рэлігійнымі пытаньнямі і зьмяшчаў нават часамі ў газэце артыкулы па гэтаму пытаньню. Трудна сказаць, быў ён беларус ці расеяц. Вельмі моцнае ўражаньне на яго рабіў бальшавіцкі тэррор.

Гэтак сама і ўсе іншыя сьведкі адзываліся аб Барысу, як аб ціхім, пачцівым і працавітым хлапцу, толькі нэрвовым і моцна ненавідзіўшым бальшавікоў.

ПАКАЗАНЬНЕ БАРЫСА КАВЭРДЫ.

У пачатку Барыс расказаў аб першых уражаньнях, якія заставіў у яго душы бальшавізм у той час, калі ён быў вучням рэальнай школы ў Самары. Першым уражаньням было тое, калі пасьля бальшавіцкага перавароту дырэктар школы не пазволіў хадзіць па тым вуліцам, па якім мы хадзілі звычайна, бо нас маглі пабіць толькі за тое, што мы былі ў зялёных шапках з белымі кантамі. Я асабіста бачыў той хаос, які пачаўся пасьля бальшавіцкага перавароту. Бачыў усе безабразьзі і зьверствы бальшавізму. На маіх вачох бальшавікі кінулі ў печ паравоза машыніста за тое, што ён адмовіўся вязьці цягнік. Я асабіста бачыў зьдзекаваньня над папом у в. Смышляеўка каля Самары.

Калі, пасьля ўхода чэскіх легіёнаў і дабравольчаскай арміі з Самары ў места вайшлі бальшавікі, дык пачаўся зьверскі тэррор. Было растрэляна шмат маіх знаёмых. І я свабодна уздыхнуў толькі тады, калі мы з сям'ёю пакінулі гэты „рай" і перастуііілі на польскую тэрыторыю.

У Вільні ў пачатку я апынуўся сярод асобаў спрыяючых бальшавізму. Я з імі ня мог ужыцца. Калі ў працэсе маіх таварышаў з беларускай гімназіі я даваў няпрыемныя для іх паказаньні, як камуністаў, мяне пачалі перасьледаваць. Працаваў экспэдытарам у беларускіх камунізуючых часопісях, якія выдаваліся за чырвонцы, пераплаўляныя з царкоўных рэчаў праваслаўнага духавенства. Гэты камуністычны дух панаваў і ў віленскай беларускай гімназіі. Толькі тады аддыхнуў, калі пачаў працаваць ў „Бел. Слове" д-ра Паўлюкевіча, вядомага антыбальшавіка. Прачытаў рад кніжак, з якіх найбольш моцнае уражаньне зрабілі на мяне раман Краснова „От двуглавага Орла к красному знамени", „Записки писателя" Арцыбашэва і польская кніжка „Ратунку".

У працягу апошніх двох гадоў я інстынктыўна чуў, што трэба дзеяць, трэба змагацца з гэтай бандаю міжнародовых зладзеяў, я хацеў ехаць у Расею, каб там пачаць барацьбу з бальшавікамі. Гэта была мая першая думка. Але моцна перашкаджалі гэтаму матэр'яльныя варункі і апрача таго я ня мог нелегальна прабрацца праз граніцу. Тады я пачаў хлапатаць аб легальным выездзе. Калі мне было адмоўлена ў візе, я рашыў забіць Войкава, як прадстаўніка гэтай банды, якая разрыла маю бацькаўшчыну і згубіла столькі людзей. Мяне зрабілі манархістым, я не манархіст — я дэмакрат. Я лічу, што ў Расеі можа быць хоць які урад, толькі не бальшавіцкі. Мне вельмі няпрыемна, што гэта здарылася ў Польшчы, на тэрыторыі страны, якую лічу сваёю другою бацькаўшчынаю. Шкадую дзеля таго, што прычыніў шмат няпрыемнасьцяў Польшы. Я забіў Войкава не як пасланніка, а як сябру камінтэрна".

Прамова Пракурора.

Пракурор у сваей прамове ўказаў, што замах Кавэрды зьяўляецца чынам аднэй асобы, а ні якой небудзь змовы. Калі б гэта была змова, дык забойства было бы учынена больш плянамерна і пры больш спрыяючых абставінах. Кавэрда забіў Войкава з старага рэвальвэра, прабіўся на пэрон, купіў пэронны білет за апошнія 20 грошаў і, учыніў забойства, нават не маніўся уцякаць. У даным выпадку прыходзіцца мець дачыненьне з барацьбою двух чалавечых адзінак, пры чым адна з іх разважала, што можа затрымаць ход гісторыі. Гэта трагэдыя, а разам і слабы бок Кевэрды. У цяперашнюю хвілю мы ня можам развязаць, на якім з гэтых бакоў стаіць гістарычная справядлівасьць

гэта ўлада не прызнана народам, што яна бязсільна,

бальшавізм зноў паказаў твар свой зьвярыны апошнімі сваімі зладзействамі, радавы ўрад зноў напомніў, што ён ня лічыцца ні з божскімі, ні з чалавечымі законамі. Гэтым ён сам адштырхнуў ад сябе увесь культурны сьвет.

Не Англія, а самі бальшавікі сваім зладзействам стварылі агульны антыбальшавіцкі фронт.

Яшчэ да апошняга маскоўскага тэррору і нахальных яе нотаў Польшчы да Англіі прылучылася Амэрыка, назваўшы маскоўскі урад „бандыцкім", апошнія-ж зьверствы маскоўскіх чырвоных катаў над усімі нявіннымі ахвярамі, іх нахальны тон у адносінах Польшчы пасьля таго, як яны, па подліннаму выражэньню лёнданскага карэспандэнта „Kur. Por."Аўгура (№ 164) „за усё сваё не лёяльнае і агіднае павядзеньне у Лёндане і Пэкіне атрымалі, што называецца па расейску „па мордзе", антыбальшавіцкі фронт яшчэ больш узмацніўся.

Атрымаўшы апляуху ў Пэкіне і Лёндане, чуючы прыбліжэньне дня страшнага суда ў сябе дома, маскоўскія дыктатары рашылі выкарыстаць Забойства Войкава для падняцьця свайго упаўшага аўтарытэту.

Дзеля гэтага высланыя Польшчы

бальшавіцкія ноты

маюць выключна агітацыйны характар. У даным выпадку рэч ня ў тым, што бальшавікі чуюць сябе абражанымі забойствам іх прадстаўніка, бо яны значна большую абразу атрымалі ў Пэкіне і Лёндане і прагнулі як пілюльку, але ў тым, каб бяз рызыкі адыграць ролю рыкаючых львоў. Карыстаючыся выпадкам Польшчы, можна зрабіць уражаньне сілы і гэткім чынам далей ашукаць расейскага „мужыка" міражам сваёй сілы і пашаны, якою быццам карыстаецца радовы ўрад за граніцаю.

Толькі з гэтага пункту гледжаньня можна зразумець бальшавіцкія ноты Польшчы, ня маючыя ў гісторыі роўных сабе прыкладаў па нахальству. У другой ноце бальшавікі жадаюць дапушчэньня свайго прадстаўніка да ўдзелу ў следзтве па справе Кавэрды і высылкі з межаў Польскай Дзяржавы ўсіх расейскіх антыбальшавіцкіх „тэррорыстычных" арганізацыяў.

Каб даказаць бальшавікам сваё шчырае жаданьне падтрыманьня міра лёяльнага выпаўненьня прынятых на аснове мірнага трактата абавязкаў, польскі Урад зрабіў на усей тэрыторыі дзяржавы

цэлы рад вобыскаў і арыштаў сярод расейскай эміграцыі,

якія не падтвердзілі бальшавіцкіх абвінавачаньняў. Хаця гэтага зусім не патрэбавалі абставіны, а тым балей не належала гэтага рабіць дзеля таго толькі, што гэтага жадалі бальшавікі. Па-першае, Польшча зьяўляецца дзяржаваю, дзе абавязуе агульнае права, не дапушчаючае істнаваньня ніякіх тэррорыстычных арганізацыяў. А па-другое, ці маюць маральнае права гэтага жадаць бальшавікі? Ня трэба гаварыць аб тым, як маскоўскія падпальшчыкі высылалі на польскую тэрыторыю

дывэрсыйныя банды,

трымалі у Менску, Полоцку, Бабруйску і іншых местах спэцыяльныя школы для падгатоўкі дывэрсыйных бандытаў, мелі спэцыяльныя ваенныя часьці рожных нацыянальнасьцяў, ўрады і г. д; як зрабілі выбух ў Сафійскай катэдры, падгатавалі пераварот у Рэулі... Нарэшце

што такое III інтэрнацыянал?

Гэта сапраўдная банда зладзеяў рожных пляменьняў і нацыянальнасьцяў на бальшавіцкай тэрыторыі, якая карыстаецца фінансавым падтрыманьнем радавага ураду і сябрам якой зьяўляецца амаль ня усе сябры камуністычнай партыі і нават самага урада. Гэта банда міжнародавых праступнікаў мае сэкцыі нямецкую, англійскую, французкую, у тым ліку і польскую, на чале якой стаіць прысуджаны ў турму і выменяны бальшавікамі быўшы пасол сойму Домбаль. Мэты III інтэрнацыяналу ўсім добра вядомы, гэтак сама як і сродкі, якімі гэтыя мэты дасягаюцца,—гэта—бомба, рэвальвэр, абман, шпіянаж, правакацыя, агітацыя, выбухі, подласьць і г д. А ці хто-небудзь можа прымусіць бальшавікоў зліквідаваць гэтую банду, пакуль істнуе радавы ўрад у Расеі?

Ні Польскі Урад, ні Польшча ня могуць адпавядаць за асабісты ўчынак Барыса Кавэрды, зроблены з ідэовых пабудкаў. Але дзеля таго, што гэты факт меў мейсца на тэрыторыі Польшчы, Польскі Урад зрабіў тое, што дыктаваў яму яго гонар, міжнародовае і дзяржаўнае права А што зрабілі маскоўскія каты ў апраўданьне замардаванага пралата Буткевіча і тысячаў, сотняў тысячаў вымардаваных па загаду чрезвычайкі польскіх і інастранных грамадзян!?

N.

ЗАКОН

Аб Гмінных самаурадах.

Скарочаная выбарка з распараджэньня гэнэральнага камісара Усходніх Зямель аб Гмінным самаўрадзе.

(Dz. Urz. Zarz. Cyw. Z. Wschodn. Nr. 21 z dn. 16 I października 1919 r. poz. 215).

(*Працяг*)

Аб паседжаньньях гміннага Ураду і яго пастановах.

На паседжаньнях гміннага Ураду Старшынёю есьць войт або яго заступнік (§ 60). Для важнасьці паседжаньня абавязкова прысутнасьць усіх сябраў гміннага Ураду. (§ 61). Пастановы прымаюцца звычайнай большасьцю. У разе роўнасьці паданых галасоў — пераважае голас старшыні (§ 62). Сябра ураду, заінтэрэсованы сам, або яго родныя і сваякі першых 3 ступеняў, у справе, якая разглядаецца, ня могуць быць прысутнымі на паседжаньні (63).

Правы і абавязкі войта.

Войт з'яўляецца выканаўчым ворганам гміны. Ен кіруе справамі і мае над імі нагляд. Яго абавязкамі ёсьць: 1) выконываньне закону, загадаў і распараджэньняў Урадавых уладаў;2) выконываньне ўсяго,што ў галіне паліцыйнай вымагаецца для утрыманьня грамадзкага спакою, парадку і бясьпечнасьці; 3) прадстаўніцтва на вонку гміны і вядзеньне ад яе імя перагавораў і г. д. з урадамі і прыватнымі асобамі, 4) выконываньне пастановаў Рады і Ураду гміннага; 5) асыгнаваньне паступпленьняў і выдаткаў гмінных; 6) перахоўваньне дакумэнтаў і дзелаводзтва гмінных 7) кіраўніцтва працай гмінных працаўнікоў і нагляд над іх дзейнасьцю (§ 52). У асабліва сьпешных выпадках усе справы падлегаючыя вырашэньню Ураду гміннага рашае войт асабіста, з тым аднак, што яго рашэньні павінны пасьля быць прыняты гмінным урадам (§ 53). Калі войт часова у выпадку хваробы, ці выезду, ня можа выконываць сваіх абавязкаў;(§55)гэтыя абавязкі выпаўняе заступнік. (§ 54) Войт, як старшыня кіруе паседжаньнямі гміннай Рады і гміннага Ураду. Войт атрымлівае сталую пэнсыю з касы гміны; войт мае права рабіць працаўнікам гміны напамненьне, або выгавар. (§ 56) Войта выбірае гмінная Рада, тайным галасаваньнем на 3 гады (гл. арт. 40). Выбор яго як і яго заступніка, павінен быць зацьверджаны Старостам (§ 41).

Аб гмінным пісару.

Пісар гмінны вызначаецца для помачы войту і гміннаму Ураду. Ен вызначаецца Староствам з пасярод прадстаўленых гмінным Урадам кандыдатаў, або выбраных Староствам. Звальняе пісара такжа Староства на жаданьне гміннага Ураду, або па іншым повадам. Пэнсыя пісару вызначаецца з гміннае касы у разьмеры, акрэсьленым Ваяводзтвам. Гмінны пісар з'яўляецца гмінным урадоўцам і падпарадкуецца войту (§ 57).

Аб сельскай (вясковай) грамадзе.

Кожная вёска, калёнія, мястэчка, засьценак або хвальварак становіць сельскую Грамаду. Яны могуць быць злучаны па некалькі разам (§ 66). Сябрамі Грамады з'яўляюцца: 1) усе сябры гміны, у межы якой ўваходзіць данная Грамада; 2) хто пастаянна жыве у межах Грамады (§ 67). Органамі Грамады ёсьць: а) солтыс і в) грамадзкае сабраньне (сход) (§ 72).

Солтыс, яго правы і абавязкі.

Солтыса і яго заступніка выбірае Грамадзкі Сход на 1 год пасярод сябраў Грамады (§ 73. Выбары адбываюцца па спосабу, устаноўленаму звычаем (§ 75). Калі выбраны кандыдат ня будзе зацьверджаны, або калі Грамада ўхіляецца ад выбараў — Староста вызначае солтыса (§ 76) Солтыс атрымлівае сталую пэнсыю ад гміны Заступнік Солтыса атрымлівае пэнсыю толькі ў выпадку фактычнага выкананьня абавязкаў солтыса (§ 77). Солтыс і яго заступнік прысягаюць перад Старостай (§ 78). Солтыс ёсьць выканаўчым і ўпраўляючым ворганам у справах Грамады. Ен павінен: 1) выконываць законы і распараджэньні, а такжа загады войта; 2) дапамагаць паліцыі; 3) прадстаўляць Грамаду на вонкі; 4) падгатаўляць прапазыкі на Грамадзкія сходы; 5) выконываць пастановы Грамадзкага Сходу (§ 80). Падчас хваробы або адсутнасьці Солтыса яго абавязкі выконвае яго заступнік (§ 81).

Аб грамадзкіх сходах.

Грамадзкі сход складаецца з усіх сябраў данай Грамады, якія маюць 21 год (§ 82). Ня маюць права прымаць удзел: 1) асобы, якія знаходзяцца пад апекай; 2) асобы, паз-

Дальш пракурор указаў, што падсудны павінен быў ехаць да сябе на бацькаўшчыну і там зводзіць парахункі з бальшавікамі. Не на чужой, а на сваей зямлі трэба змагацца з благам.

Рэшта прамовы пракурора была пасьвяшчана аб аснове рашэньня пракуратуры перадаць гэтую справу ў палявы суд. Пасланнік Войкаў быў забіты, як афіцыяльная асоба, дзеля таго, што ён стаў гэткім з моманту уручэньня п. Прэзыдэнту Польскай Рэспублікі сваіх вярыцельных грамат. Афіцыяльны характар яго прабываньня ў Польшчы быў прызнаны Польскімі Уладамі і дзеля гэтага ў дадзеным выпадку павінен мець мейсца палявы суд. Пытаньня аб ступені наказаньня — закончыў пракурор — я ня буду датыкацца. Вырашэньне яго перадана ў вашы рукі, паны судзьдзі. Вы зьяўляецеся караючым і мілуючым суменьнем Польскай Рэспублікі".

Прамова адваката Нядзельскага.

Першым выступіў з абаронаю варшаўскі адвакат Нядзельскі, быўшы прысяжны паверaны вокруга кіеўскай судзебнай палаты. Яго прамову, поўную шчырага абурэньня па адрэсу бальшавікоў, ня мог слухаць Розэнгольц, які нэрвова круціўся на крэсьле і пакінуў салю паседжаньня, як толькі была скончана прамова.

Адвакат Нядзельскі у сваей прамове гаварыў галоўным чынам аб ідэйным баку забойства. Ен указаў, што ў працягу 2 тысячаў гадоў ідэалам усяго культурнага чалавецтва была запаведзь Хрыста „не забівай“ „не крадзі“ „любі бліжняга свайго“. На гэтай запаведзі выхавалася чалавецтва. I вось, пасьля 2 тысячаў гадоў жыцейскае мора вынясла на сваіх хвалях кучку лжэпрарокаў, якія прапаведаюць: „граб, мардуй, ненавідзь, крадзі“.. Далей абаронца цытуе словы Леніна, Троцкаго Духарына, Луначарскага, Зіноў'ева, Дзяржынскага і інш., праслаўляючых масавае забойства і выказываючыхся за тэррор, як за сродах для распаўсюджаньня камуністычных ідэяў, імі прапаведаемых.

Хто зьяўляецца супольнікам падсуднага? **МІЛЬЕН СЕМ СОТ ТЫСЯЧАУ АХВЯРАУ**, замардаваных бальшавікамі, разарэньня і убожыства страны. Гэты небывалы тэррор, пачаты бальшавікамі, заставіў пакінуць родную зямлю мільёны людзей, для якіх найбольшаю пакутаю зьяўляецца тое, што бальшавікі наглуха зачынілі перад імі дзьверы для зварота на родную зямлю і абвясьцілі, што ў іх німа выгнаннікаў бацькаўшчыны. Пры гэткіх абставінах німа нічога дзіўнага ў тым, што родзіцца думка аб рэвашы, ці нават аб самаабароне, бо бальшавікі не пакінулі у супакоі пакінуўшых Расею і стараюцца усімі сіламі іх зьнішчыць.

Чым адказала эміграцыя на гэты масавы тэррор, на усё тое гора, якое ей прычынілі і прычыняюць бальшавікі? У 1923 г. Канрадзі ў Швэйцарыі забіў бальшавіцкага прадстаўніка Вароўскага, а ў 1927 г. Кавэрда ў Польшчы забіў радавага прадстаўніка Войкава. **ТОЛЬКІ ДВА ВЫСТРАЛЫ ЗА 1,700,000 НЯВІННЫХ АХВЯРАУ БАЛЬШАВІЦКАГА ТЭРРОРУ, І РАЗАРЭНЬНЕ ПОУТАРАСТА МІЛЬЕННАЙ ДЗЯРЖАВЫ!** Эміграцыя і эўрапэйская цывілізацыя, сьледуя запаведзі Хрыста „не забівай“, аказаліся дастойнымі насьледаваннікамі гэтай запаведзі.

Польшча з другімі народамі гэтак сама абараняе гэту запаведзь і дзякуючы ей сеючыя забойства і імкнуючыяся да гібелі усяго сьвета, карыстаюцца ў Польшчы падлежачай абаронаю і ахранаю. Два выпадкі адказу Эўропы на нязьлічымыя зьверствы зьяўляюцца доказам таго, як Эўропа ўпітала ў сябе гэта пачуцьце парадку і лёяльнасьці. Крок Кавэрды—гэта голас, крычачы „не забівай“, гэта абарона хрысьціянства і прынцыпа любві да бліжняга. Кавэрда учыніў адно забойства, але за ім стаіць магутная арганізацыя: з аднаго боку мільёны пакутуючых, а з другога—мільёны замардаваных і дух гэтых апошніх падняў слабую руку Кавэрды для забойства Войкава. Кавэрда гэта маленькая лупінка, прынесеная на хвалях мора крыві з Усхода на Захад. Але мы, палякі, павінны больш, чым хто іншы, зразумець роспач і гора расейскай эміграцыі Кавэрда ужо сам сябе пакараў, на сваю чыстую дзяцінную душу ён палажыў пляму забойства, сапсаваў сабе жыцьцё, а сямью пазбавіў падтрымацеля. За кратаю турмы ён доўга яшчэ будзе пакутаваць за бацькаўшчыну і ламаць у нямой безнадзеі рукі.

Кавэрда хацеў ехаць да Расеі, каб там зьвясьці парахункі з уцісканнікамі сваей бацькаўшчыны. Ен стараўся атрымаць права на выезд, але яму ў гэтым было адмоўлена. Усе гэтыя фатальныя абставіны і штырхнулі яго на шлях забойства. Многія з эмігрантаў хацелі бы вярнуцца на бацькаўшчыну, каб там, твар з тварам, змагацца з бальшавікамі. Але чуйнае вока сачыць за імі, не дазваляе ім гэтага зрабіць і вынікам гэтага зьяўляецца тое, што на чужой зямлі здараюцца выпадкі, падобныя таму, які меў мейсца ў Варшаве.

КНЯЗЬ ДАЎГАРУКАЎ.



Першая ахвяра новай хвалі чырвонага тэррору у С. С. Р. Р.

Сваю прамову абаронца закончыў просьбаю, зьвярнутаю да судзьдзяў аб тым, каб, выносячы асуд, прынялі пад увагу тое няшчасьце, якое нацянуў на сябе Б. Кавэрда, абараняючы Крыж і Бацькаўшчыну.

Асуд суда.

ДАРАЗНЫ (ПАЛЯВЫ) СУД У СКЛАДЗЕ СТАРШЫНІ ГУМІНСКАГА і СУДЗЬДЗЯЎ КАЗАКОЎСКАГА і СКАВІНСКАГА АД ІМЯ РЭСПУБЛІКІ ПАСТАНАВІЎ ПАЗБАВІЦЬ БАРЫСА КАВЭРДУ УСІХ ПРАВОЎ ГРАМАДЗЯНСТВА і ЗАКЛЮЧЫЦЬ У КАТАРЖНУЮ ТУРМУ БЯЗ СРОКА. АДНАЧАСНА З ГЭТЫМ СУД ПАСТАНАВІЎ ЗЬВЯРНУЦЦА ПРАЗ МІНІСТРА ЮСТЫЦЫІ ДА ПРЭЗЫДЭНТА РЭСПУБЛІКІ З ПРОСЬБАЮ АБ СКАРОЧАНЬНІ ВЫЗНАЧАНАЙ КАВЭРДЗЕ КАРЫ ДА 15 ГАДОЎ КАТАРЖНАЙ ТУРМЫ.

Водгукі забойства Войкова.

У зьвязку з забойствам Войкава радавы ўрад прыслаў Польшчы новую ноту, падпісанную заступнікам Чычэрына Літвінавым. У гэтай ноце бальшавікі жадаюць ад Польшчы: 1) прыняцьця польскім урадам усіх неабходных сродкаў для ўсебаковага выясьненьня пытаньня, выяўленьня „усіх віноўных і строгага ўкараньня вінаватых, спецыяльне забойцы. 2) Польскі Ўрад павінен дапусьціць радавага поўнамоцніка да удзелу ў расьледаваньні гэтай справы і 3) Польскі Ўрад павінен прыняць энэргічныя сродкі ў кірунку ліквідацыі на польскай тэрыторыі дзейнасьці тэррорыстычных і бандыцкіх арганізацыяў і асобаў, скіраванай проці С.С Р.Р. і яго прадстаўнікоў і высяленьня з межаў Польскай Рэспублікі асобаў, вядучых гэткую дзейнасьць.

ЖАДАЮЦЬ НОВАЙ КРЫВІ.

Усе бальшавіцкія часопісі на чале з „Ізвесьцямі“ вельмі незадаволены і абураны варшаўскім асудам Б. Кавэрды. Яны чакал сьмертнага прыгавору.

ЧЫРВОНЫ ТЭРРОР У ССРР.

У Адэсе прыгавораны да растрэлу 11 асобаў, быццам за шпіянаж на карысьць Румыніі. У Маскве растрэляна не 20 заложнікаў „буржуяў“, як паведамлялася раней, а 23 На чале іх князь Паўла Доўгарукаў, 72 гадоў, быўшы віцэ-старшыня другой „Государственной Думы“, аб якім уся польская прэса адзываецца з глыбокім пачуцьцем Прогрэсыўны „Kur. Por.“ піша, „увесь яго палітычны і сацыяльны сьвятапагляд быў проціўстаўленьнем ўсякаму манархізму і рэакцыі. Доўгарукаў быў шчырым дэмакратам, пацыфістым (прыхільнікам ідэі міра) і ідэалістам. Ен быў рашучым і адкрытым прыяцелям Польшчы яшчэ ў часе яе няволі“. П. Доўгарукаў нелягальна перайшоў бальшавіцкую граніцу, пераадзеўшысь старцам, каб пабачыць родную зямлю. Першы раз бальшавікі зхапілі яго, але скора выпусьцілі, лічачы яго простым і бездакумэнтным старцам. Пры другім пераходзе граніцы ізноў злавілі яго і на гэты раз пазналі і засадзілі да турмы, дзе ён і таміўся бяз суда, як заложнік, пакуль чырвонаму „молаху“ не захацелася новай крыві. Сярод растрэляных бяз суда знаходзіцца гэтак сама фінляндзкі грамадзянін, быўшы ротмістар, Эльвэнгрэн. На поваду яго Фінляндзкі Ўрад выслаў у Маскву ноту, жадая тлумачэньня ад маскоўскага ўраду. Ня толькі дробная правінцыянальная, бальшавіцкая прэса, але нават афіцыёз „Ізвесьця“ і „Праўда“ жадаюць ўваскрашэньня тэррору, які быў пры кацe Дзяржынскім. Гэтыя газэты лічаць, што 20 „буржуяў“ за сьмерць Войкава мала і жадаюць новых ахвяраў, новай крыві.

Гэта зьверствы маскоўскіх катаў, гэты масавы тэррор [за замахі на менскага чэкіста Апанскага, петраградзкага дыктатара — Мэсінга і Войкава абурылі ўвесь цывілізаваны сьвет. Адказам на гэтыя зьверствы зьявілася агульная пагарда. Умяркаваная англійская газэта „Морнінг Пост“ у зьвязку з новаю хваляю чырвонага тэррору ў радавай Расеі піша: „падобны акт помсты да няшчасных людзей, якія месяцамі таміліся бяз суда ў турмах, здольны выклікаць у цэлым цывілізаваным сьвеце толькі пагарду“. Але на гэтых ахвярах яшчэ не канец. Кожны дзень прыносіць весткі аб новых масавых арыштах і растрэлах па усей тэрыторыі радавай Расеі.

З кожным днём надходзяць ўсё новыя і новыя весткі аб масавых забойствах і шалу чрэзвычайкі. У лік першай разстрэлянай пачкі „20“ на чале з кн. Доўгорукім не вайшло шмат растрэляных ў Петраградзе, Кіеве і сядзеўшых ў ізаляцыйных камэрах Суздальскага манастыра. Ініцыятарамі растрэлаў зьяўляюцца Аржанікідзе, Уншліхшт, Яраслаўскі, збіўшыся з панталыку Сталін і галоўны кат „чэка“ Менжынскі.

Цэнзура прэсы (а трэба ведаць, што ў С. С. Р. Р. істнуе толькі урадавая прэса) значна узмоцнена. Прыватныя тэлеграмы у Маскве ня прыймаюцца. Настрой у месьце нэрвовы. Чакаюць аб'яўленьня выключнага палажэньня. Г. П. У. пагражае, што ў выпадку „новых выступленьняў“ проці „Расеі“, будзе растрэляна 25 новых заложнікаў, сядзячых у турмах. З провінцыі прыбываюць трывожныя весткі. У кіргізкай рэспубліцы дайшло да спатычкі між насяленьням і войскам, у выніку чаго было аб'яўлена асаднае палажэньне.

Больш 100 ахвярау Чырвонага Тэррору.

Англійскія газэты паведамляюць, што ў Маскве растрэляна яшчэ 28 быўшых афіцэраў. Агульны лік ахвяраў апошняга тэррору перавышае 100 Турмы ў Петраградзе і Маскве перапоўнены.

ЧЫРВОНЫ КАТ.



Кіраўнік Усерасейскай чрэзвычайкі Менжынскі, па загаду якога робяцца цяпер масавыя растрэлы бяз суда.

Кожны дзень новыя масавыя растрэлы.

У Жытоміры растрэляны бяз суда і следзтва быўшыя афіцэры Борашка і Косьцінскі. У Менску растрэляны два палякі быццам за „шпіянаж“. У Менску прыгавораны да сьмертнай казьні 32 быўшых афіцэры. У Владывастоку растрэляны 4 быўшыя афіцеры.

Б'ЮЦЬ КАМУНІСТАУ.

Каля Масквы забіты сябра калегіі камісарыяту Гандлю камуніста Тураў, а Кіеве—сябра Ц. І. К. С. С. Р. Р. камуніста Калінін.

РАСТРЭЛ СЯБРАУ УКРАІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАРТЫІ.

З Харкова паведамляюць, што ў Умані арыштаваны і пасьля бяз суда разстрэляны сябры ўкраінскай нацыянальнай партыі Хаенка, Ваўка Валука і Асадчук.

ПАНІКА У МАСКВЕ І ПЕТРАГРАДЗЕ.

Настрой ў Маскве і Петраградзе вельмі нэрвовы. Чужаземцы у перапалоху пакідаюць Маскву. Перад консульствамі стаяць масы жадаючых атрымаць пашпарты і візы для выезду.

Прызыу запасных на Украіне.

З Масквы паведамляюць, што тэрыторыяльная армія Украіны, зьяўляючаяся першым рэзэрвам на выпадак мабілізацыі, якая ў папярэднія гады прызывалася толькі на 3-х нядзельныя зборы, прызвана цяпер пад руж'ё на 4 месяцы. Радавая Улада тлумачыць гэты сродак быццам неабходнасьцьцю удасканаленьня ваеннай падгатоўкі запасных. Гэткім чынам чырвоная армія на Украіне павялічылася на 300,000 чал.

ПАЛЯЦЬ.

У Жытоміры згарэў да тла гмах губэрнскага выканаўчага камітэту. Пажар перакінуўся на суседнія будынкі, ў выніку чаго згарэла тэхнічная школа і некалькі жылых дамоў. Радавыя улады абяцалі награду за паімку падпальшчыкаў.

ПАУСТАНЬНЕ НА КАУКАЗЕ.

На Каўказе выбухла паўстаньне. У некалькіх губэрніях, у тым ліку і ў Тыфліскай аб'яўлена асаднае палажэньне. Ня гледзячы на гэта спатычкі між арміяй і паўстанцамі ня спыняюцца.

Апошнія растрэлы.

Акружны суд у Харкаве прыгаварыў на сьмерць 2 польскіх грамадзян — Кніплінскага і Вержбовіча. Прыгавар выкананы. Кніплінскі і Вержбовіч абвінавачаны былі быццам у „шпіянажы“.

У Маскве растрэляны быўшы марскі капітан Ленікаў, гэтак сама ў Маскве растрэлян нямецкі грамадзянін Дэббэрт, абвінавачаны ў шпіянажы.

У страху вочы вялікія.

Ваенны камісар Варашылаў выступіў у Маскве з ярка-агітацыйнаю прамоваю, скіраванаю проці Англіі, у якой указаў, што „вайна з буржуазным сьветам няўнікнёна і можа пачацца праз некалькі месяцаў“. Заяву Варашылава пацьвярджае і цыркуляр цэнтральнага камітэту камуністычнай партыі, прадпісаўшы усім партыйным арганізацыям зараз-жа часпачаць ваенную падгатоўку сябраў камуністычнай партыі.

Калінін прадбачыць вайну.

Чырвоны „прэзыдэнт“ Калінін сказаў на сабраньні работнікаў прамову аб міжнароднай палітычнай сытуацыі. Ен заявіў, што ніхто сяньня ня можа прадбачыць, ці вайна выбухне цераз некалькі дзён, ці месяцаў У кожным разе работніцкая кляса павінна быць заўсёды гатова, каб магчы адбіць усе атакі. У канцы Калінін выказаўся за павялічэньня арміі.

Троцкі проці Зінау'ева.

Цэнтральны камітэт комуністычнай партыі пастанавіў выключыць Троцкага і Зіноўева з ліку сваіх сяброў. Гэта пастанова перадана на зацьверджаньне палітбюро. Пытаньне аб астаўленьні Троцкага і Зіноўева ў партыі будзе залежыць ад іх далейшага павядзеньня.

Крэстынскі у Маскве.

Прыбыўшы ў Маскву радавы пасланнік у Бэрліне Крэстынскі зрабіў даклад на паседжаньні рады народных камісараў аб пазыцыі Нямеччыны ў Англійска-радавым канфлікце. Даклад быў прыняты з прыемнасьцью і Крэстынскі атрымаў надзвычайныя поўнамочча для далейшых перагавораў з Нямецкім Урадам.

баўленыя правоў, або агранічаныя у правох па суду; 3) асобы, утрымліваючыя рэстарацыі (шынкі) (§ 83). Старшынёю сходу ёсьць солтыс (§ 84). Сходы склікае Солтыс у меру патрэбы, а такжа на загады войта ці на жаданьне 1/10 часьці грамадзян, маючых права прымаць удзел у Сходзе (§ 85). Для важнасьці Сходу павінна быць прусутна 1/4 часьць грамадзян, маючых права прымаць удзел у сходзе (§ 86).

Межы дзейнасьці Грамадзкага Сходу.

Грамадзкі сход: 1) выбірае солтыса і яго заступніка; 2) упраўляе маемасьцяй гміны, якая знаходзіцца у межах Грамады, згодна з даручэньнямі Рады гміннай; 3) нараджаецца у справах спэцыяльных патрэбаў Грамады у межах дзейнасьці гміны (§ 15), з мэтай прадстаўленьня гэтых патрэбаў гміннай Радзе (§ 87) Пастановы прымаюцца звычайнай большасьцю галасоў, а у разе роўнасьці за і проці — прапазыка ці пастанова адкідваецца (§ 88). Сходы і галасаваньне на іх адбываюцца паводле месцавых звычаяў (§ 89).

Нагляд над гміннымі Грамадамі.

Нагляд над гмінамі і сельскімі Грамадамі спраўляе ў першай інстанцыі павятовы Староста, у другой і апошняй — Ваявода Жалабы ў вышэйшую інстанцыю на пастановы ніжэйшай падаюцца у 2 тыднёвы тэрмін ад дня атрыманьня пастанаўленьня, на якое прыносіцца жалаба (§ 90). Калі гміна не выконывае сваіх абавязкаў згодна з бюджэтам, альбо выконывае блага — наглядныя ўлады даюць адносныя загады (§ 92). Ваявода мае права распусьціць гмінную Раду. У гэткім выпадку у працягу 3-х тыдняў вызначаюцца новыя выбары. Да выбараў абавязкі свае выконвае стары урад гміны, аднак без права збываць ці заменяць нярухомасьці гміны (§ 93). Войта, яго заступніка, лаўніка, Солтыса і яго заступніка Староста можа звольніць. На гэта можа быць падана жалаба Ваяводзе (§ 94). Наглядныя улады маюць права рэвізыі. Такія-ж правы рэвізыі прыслугоўваюць і вышэйшым адзінкам Сэмаўраду (§ 97).

Канец.

Пашырайце роднае слова!

Апошнія навіны.

З ПОЛЬШЧЫ.

Скліканьне сойму на надзвычайнае паседжаньне.

Дыкрэтам Прэзыдэнта Рэспублікі склікан сойм на надзвычайнае паседжаньне. Сэнат ня склікаңы. Галоўным пытаньнем на павестцы паседжаньня — прапазыка сацыялістаў аб самароспуску.

Надзвычайная сэсія Сэнату.

22 чэрвеня пачалася надзвычайнаь сэсія Сэнату.

Перавязеньня астанкаў Славацкага з Парыжа да Польшчы.

Уся Польшча шыкуецца да ўрачыстага прыняцьця астанкаў вялікага свайго пісьменніка Юльяна Славацкага памёршага на чужыне ў часе польскай няволі. Параход з астанкамі Ю. Славацкага ўжо выйшаў з францускага порту Шэрбурга. Ён будзе пасьля кароткай астаноўкі ў Варшаве адвезены да Кракава

Працэс 61 камуністаў у Луцку.

У луцку закончыўся працэс 61 камуністаў, які цягнуўся ад 22 траўня да 17 чэрвеня. З абвінавачаных 26 зьбеглі, проці 25 не было прад'яўлена абвінавачаньне з повад у адсутнасьці доказаў праступнасьці, а 61 заселі на лаве падсудных. Суд прыгаварыў: 3 - на бязтэрміновую турму, 3 - на 15 гадоў, 8—на 8 г., 3—на 6 г. 7—на 4 г. 5—на 2 г. і 1—на 1 г. цяжкай турмы, 23 апраўданы.

Лео Бэльмонт апраўдывае учынак Кавэрды.

Пісьменнік Лео Бэльмонт апублікаваў адкрытае пісьмо у якім апраўдывае ўчынак Кавэрды. У сваем пісьме Бэльмонт напамінае аб забойстве царскай сям'і і аб выпадку польскай тэррорысткі Крагельскай, зрабіўшай замах на гэнэрал-губэрнатара Скалона.

З ЗАГРАНІЦЫ.

Сэсія Рады Лігі Народаў.

У Жэнэве адкрылася чырвоная сэсія Лігі Народаў з удзелам Штрэзэмана, Чэмбэрлена, Брыяна, польскага мін. заграпічных справаў Залескага, Бэнэша і інш. На гэтай сэсіі апрача бягучых справаў абгаварывалася на тайных паседжаньнях і прыватных канфэрэнцыях паасобных міністраў пытаньне аб англійска-радавым разрыву адносінаў, тэрроры ў С. С. Р. Р. забойству Войкава і бальшавіцкіх нотах Польшчы. Гэтае пытаньне адцягнула нават увагу Рады Лігі ад албанска-сэрбскага канфлікту.

Закрыцьце сэсіі Рады Лігі Народаў.

Сэсыя Рады Лігі Народаў ужо закрылася. Апрача афіцыяльных паседжаньняў адбыліся дзьве закрытыя канфэрэнцыі „пяці" і „шасьці", пасьвяшчоныя пытаньню аб бальшавізму і нямецкім разбраеньнем.

ВАЕННАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЛІТОЎЦАЎ НА ПОЛЬСКАЙ ГРАНІЦЫ.

20 чэрвеня каля Аран распачаліся вялікія манэўры літоўскай арміі. Манэўры будуць цягнуцца цэлы месяц. У іх прыйме ўдзел амаль ні уся армія, ваенная школа, вышэйшыя афіцэрскія курсы і школы паасобных радоў аружжа. Асаблівая ўвага будзе зьвернута на артылерыйскую падгатоўку.

МІНІСТЭРСКІ КРЫЗЫС У РУМЫНІІ.

Пасьля адстаўкі кабінэту гэн. Авэрэску стварыўся кабінэт князя Сцірбэя. Але гэты кабінэт ня доўга пратрымаўся. Ужо выйшлі ў адстаўку пяць міністраў і чакаюць, што новы кабінэт кн. Сцірбэя падасьць у адстаўку.

Уся Эўропа проці чырвоных катаў.

Уся бэрлінская прэса зьмясьціла цікавы поўафіцыяльны камунікат аб адносінах да радавай Расеі, прысланы з Жэнэвы нямецкай дэлегацыяй у Лізе Народаў. У гэтым камунікаце гаворыцца, што Англія ў

Тутэйшая хроніка.

Сэнат віленскага Унівэрсытэту Стэфана Баторыя выбраў зноў рэктарам на наступны год праф. Станіслава Пігаля, а прарэктарам - праф Марьяна Здзехоўскага.

—ВЫБАРЫ ДА ВІЛЕНСКАГА МАГІСТРАТУ. У нядзелю 19 чэрвеня адбыліся выбары да віленскага магістрату, даўшыя наступныя вынікі: беларускарасейскі блёк — 1 мандат сацыялісты — 9, жыдоўскі „Бунд"—3, жыдоўская нацыянальная партыя—9, прагрэсысты—5, манархістыч —4, хрысьціянскія дэмакраты (эндэкі)—11 і камуністы — 5. літоўцы — 1.

— СВАЯ СВАІХ НЕ ПАЗНАША...—Сяль. Ніва ужо другі раз зьмяшчае карэспандэнцыю з Баранавічаў аб тым, што на вёсках шлындаецца нейкі Цэйлоўскі і баламуціць сялян...

Вось дык гумарыстыка! Безграматныя сельсаюзьнікі з Нівы „забыліся", што гэты Цэйлоўскі першы прыяцель і супрацоўнік іхняга лідэру п. Рагулі..

„Забыліся" што з гэтым Цэйлоўскім Рагуля ня даўна клеіў гурткі Інстытут Гаспадаркі і Культуры у Баранавіцкім павеце.

„Забыліся„ што іх ні-жа Рагуля з гэтым мэжа Цэйлоўскім дружна і лоўка „выдабылі" дакумэнт ад б. сябры Прасьветы Плаўсюка з Баранавічаў...

„Забыліся" і сяньня лаюць свайго саюзьніка і супрацоўніка Гумарыстыка з гэтым сельсаюзам!.,

—Выгнаньне з раю... Адама, Ярэмы і Васіля. Яшчэ пару нумароў назад мы пісалі аб развале Рагуль-Ярэміцкага „Сель-Саюзу" Падавалі факты, што ня толькі ніякіх новых аддзелаў Саюзу нідзе не адчыняецца, што яго ня толькі чураецца сялянска маса, але што яго кідаюць гэткія асобы, як сябра цэнтральнага камітэту Х. Шыбут і рэдактар Сель — Нівы Міцько. Але пададзеная ў аднаднёўцы „Народ." пастанова рэшты сельсаюзьнікаў аб выключэньні з складу саюзу паноў Ярэміча Рагулі і Більдзюкевіча нават нас здзівіла.

Проста гэтак узялі дый і выгналі сваіх правадыроў з саюзу, бяз мундзіра і пэнсыі... І гэта у той мамэт, калі усё бліжэй і бліжэй падыходзяць выбары да новага Сойму... А столькі была пыхі, столькі лятуценьняў і надзеяў! А цяпераka прапала апошняя надзея на мандацікі як свая-ж арганізацыя выгнала вон. Праўда застаюцца і дамкі і зямелька з сннакосам „зробленыя" падчас пасолўства, але з вялікага пана—пасьля варочацца да разьбітага карыта -- зноў стаць маньцёрам, ці безработным настаўнікам і няпрыемна і нялоўка. Эх, жыцьцё было! Прамовы, гонар, 1-ай кляса і тысячная пэнсыя і прыватныя даходы, даскапалы пасольскі буфэт і г. д. і г. д.

Усё прапала згінула, мінула як цудны, залаты сон.

Бедныя, бедныя выгнаньцы!

пачатку ня мела замеру прыймаць якія-небудзь крокі проці радаў. Затым лічылі разрыў англійска-радавых адносінаў пытаньнем, датыкаючымся выключна Англіі і Расеі. Але работа III інтэрнацыянала выклікала незадаволеньне ў цэлай Эўропе. Цяпер стварылася гэткая сытуацыя, што міністэрствы унутраных справаў амаль ня усіх дзяржаваў робяць націск на міністраў заграпічных справаў жадаючы ад іх прыняцьця рашучых крокаў проціў радавай Расеі. Гэткі настрой ахапіў усю Заходнюю Эўропу. Вельмі характэрна, што гэты камунікат падае бяз усякіх камэнтарыяў нямецкая прэса.

Націск на Нямеччыну.

Нямецкая преса у апошніх сваіх паведамленьнях з Жэнэвы ставіць на першае мейсца англійска-радавы канфлікт, як не больш паважную праблему, якою займаюцца цяпер сябры Рады Лігі на закрытых паседжаньнях. Адна з паважнейшых часопісяў паведамляе, што заходня-эўрапэйскія дзяржавы робяць сур'ёзны націск на Нямеччыну з мэтаю вывясьці яе з нэйтральнага становішча. Часопісь падкрэсьляе, што ня можа быць ніякага сумліву ў тым, што і Нямеччына асуджае маскоўскі крывавы тэррор і вядзе барацьбу з III інтэрнацыяналам. Аднака-ж ад гэтай барацьбы да зьмены нямецкай палітыкі нэйтралітэта яшчэ далёка.

Ніткі усіх праступленьняў вядуць да Чырвонага Крэмля.

У Будапэшце былі заарыштованы тры асобы, высланныя расейскімі камуністамі з Вены з даручэньням замардаваць заступніка будапэштаўскай паліцыі Гэтэныі, за галаву якога маскоўскі ўрад вызначыў нагараду ў суме 40,000 даляраў. Усякія камэтарыі да гэтага збытачны.

Бьюць і плююць у твар.

З парыжа паведамляюць аб гэткім выпадку, меўшым мейсца на вечары расейскіх эмігрантаў. Старшыня сабраньня у сваей прамове прыхільна адазваўся аб растрэляных у Маскве ахвярах Г. П. У. і запрасіў прысутных ушанаваць памяць разстрэляных. Адзін малады чалавек у аднэй лёжы дэманстратыўна застаўся сядзець, і толькі як усе прысутныя запратэставалі, ён устаў. Адзін сівы пан падайшоў да яго і плюнуў яму ў твар, а адна маладая пані ударыла яго па твары Паднялася бойка, у часе якой дэманстрант быў акрываўлян і выкінут вон. Ён аказаўся супрацоўнікам радавага пасольства ў Парыжу.

САМІ КАНЧАЮЦЬ САМАГУБСТВАМ.

У сэнаторыі каля Дрэздэна ў Нямеччыне пакончыў самагубствам быўшы бальшавіцкі камісар здароўя Тарасэвіч. Ён прабаваў павесіцца на раме вокна пры помачы 2 насавых хустак, але хусткі ня вытрымалі, і Тарасэвіч зьляцеў з 2 атажа на брук, забіўшыся на сьмерць. Камуністы паднялі крык у прэсе, быццам на Тарасэвіча быў зроблен замах. Але зробленае следзтва адкінула гэту ману.

Японскі пасланнік пакінуў Пэкін.

Японскі пасланнік неспадзеўна пакінуў сталіцу. У зьвязку з гэтым амэрыканскае пасольства гэтак сама рыхтуецца да эвакуацыі з Пэкіна. Англійскае пасольства часова спыніла эвакуацыю і застаецца у Пэкіне.

Чанг-Тсо-Лін на чале усіх антыбальшавіцкіх сілаў.

Манжурска-пэкінскі дыктатар маршалак Чанг-Тсо-Лін стаў на чале усіх ваенных сілаў, выступаючых проці арміяў Куомінтанга (сацыялістычная партыя).

УСЯЧЫНА.

Новы пералет праз Атлянтыцкі акіян.

Не пасьпелі закончыцца ўрачыстыя прыёмы у Парыжу і Лёндане у чэсьць Ліндбэрга, пераляцеўшага бяз супынку Атлянтыцкі акіян у працягу 33 гадзін, як другі амэрыканскі авіятар Чэмбэрлен пабіў новы рэкорд: пераляцеў Антлянтыцкі акіян бяз спуску ў працягу 27 гадзін. Ён меў на мэце спусьціцца дзесь між Менскам і Масквою, але мусіў спусьціцца з прычыны нестачы бэнзыны ў Саксоніі ў 100 кілёмэтрах ад Бэрліна, пераляцеўшы 7,000 кіл. у працягу 42 гадзін, пабіўшы рэкорд Ліндбэрга ў скорасьці і прасторы. На аэрапляне Чэмбэрлена знахадзіўся пасажыр Чарльз Левін, фінансаваўшы гэты адважны палёт. Пасьля гэтага сьмелага палёту можна быць пераканаными, што ў хуткім часе Вялікі і Атлянтыцкі акіяны ня будуць прадстаўляць ніякіх перашкодаў для паветранай камунікацыі, між Старым і Новым Сьветам, скарочываючы у пяць — сем разоў час патрэбны для змаганьня гэтага прастору на самых худкаходных параходах.

Пісьмо у рэдакцыю.

ПАДЛЕЦ.

Подлы Луцкевіч, вядомы тайны комуністычны агэнт і правакатар дапусьціўся апошнімі днямі двух новых подласьцяў. Па першое у N 19 сваей комуністычнай рэптыліі ён напісаў на мяне данос гэткага зьместу. „Забойца Войкава Барыс Кавэрда — агэнт д-ра Паўлюкевіча, а у N 20 новы данос пад назовай „па нітачцы да клубочку". дзе зусім выразна прапануе паліцыі зрабіць у мяне вобыск і арыштаваць мяне і 2) у N аб Барысу Кавэрдзе засуджаным на бэзтэрміновую катаргу, аб якім ня толькі уся бяз вынятку польская прэса але і сам суд адзываўся як аб ідэёўцу і чыстай, шляхэтнай натуры — напісаў паскудныя лжывыя рэчы. З той прычыны, што Луцкевіча нават па твары ударыць нельга бо ён ужо біты і ніяк не рэагаваў на гэта, я цягну яго і зіц-рэдактара „Нашай справы" да судовай адказнасьці. Што датычыцца другога дык падаю аб гэтым да публічнага ведама, як аб новым факце подласьці Луцкевіча.

А. Паўлюкевіч

* * *

Паважаны Пане Рэдактар!

Прашу зьмясьціць у Вашай газэце наступнае

Пан Вацлаў Свенторжэцкі, вялікі абшарнік, бо у Палачанскай гміне Маладэчанскага павету мае 5 маёнткаў— Палачаны, Яхімоўшчына, Рачкава. Кучук: і Малюны, у 1921 годзе, калі я з polecenia „Rady Ludowej" (Straży Kresowej) збіраў матэрыял (скаргі) аб „нэдужыцьцях" і кіраваў іх да адпаведных Урадоў, — гэта вельмі не падабалася п. Свенторжэцкаму, бо ён тады надта жорстка распраўляўся са сваімі суседзямі сялянамі і служачымі парабкамі, ня гледзячы на многа гадовую службу у маёнтках, выкідаў іх бяз суда на вуліцу і тасаваў цэлы рад іншых рэпрэсыяў. Напрыклад гэтак прыціснуў Аляксандра Конана, што той, бедак з роспачы пашоў, ды павесіўся.

А між тым п. Свенторжэцкі пры помачы сваіх лёкаяў — Міхалкі Легане, Сьцяпана Міньkоўскага, Фэлькі Логунова, Вацлава Конушынскага і іншых сьведкаў абвінаваціў мяне ў „антыдзяржаўнай дзейнасьці". Да вядзеньня следзтва судовымі установамі я з „ласкі" п. Свенторжэцкага адсідзеў у Навагрудзкай турме 6 месяцаў За гэта п. Свенторжэцкі пазволіў сваім сьведкам бязплатна накасіць сена і нябраў часткі з зямлі засеянай імі. Ня гледзячы на тое, што Пракурор некалькі разоў спыняў гэту справу за атсутнасьцю доказаў віны, гэтыя паны падымалі яе зноў выдумываючы новыя і новыя абвінавачаньні

Рабілі лжывыя даносы паліцыі і адміністрацыі, абы гэтакім чынам пазбавіць мяне выбарчага права і грамадзкай свабоды, як абаронцу правоў беларускага Народу.

І вось цяпер, калі даведаўся п. Свентаржэцкі, што я выступіў з „Вызваленьня" ды далучыўся да Беларускай Нацыянальнай Партыі і Рады, пачаў ізноў чап'цца да мяне. Гэтак раніцай 15 чэрвеня г. г. калі мой конь сарваўся з прывязі і зайшоў на папар п. Свенторжэцкага, сторож яго Лужчык забраў у хлеў, а мяне загадаў чакаць, пакуль ўстане пан. Пан Свенторжэцкі устаў ў 12 гадзіне, і я зьвярнуўся да яго с просьбай аддаць каня, п. Свенторжэцкі адказаў: U nas taksa taka—o ile koń złapie się na ugory. to płata jednorazowa dla porządnybh ludzi 3 zł, dla nieporządnych 5 zł., a dla komunistów 7 zł., więc masz płacić za kon'a 7 złotych; w przeciwnym wypadku konia odprowdzę do Policji i tam zaplacisz podwójnie".

Да гэтага часу п. Свенттаржэцкі трымае ў хляву галоднага каня з ланцугом і уздэчкаю і не аддае ні мне ні Паліцыі. Дзеля гэтага прашу Рэдакцыю даць параду: што зрабіць, каб адабраць ад п. Свентаржэцкага свайго каня, бо нямаю чым рабіць поля і дакончыць сяўбы лубіна пад жыта.

с пашанаю

Мацей Пятровіч.

17 чэрвеня 1927 году.

АД РЭДАКЦЫІ. Справа скіравана да Палачанскага Старосты.

Ад цэнтральнага выбарнага К-ту у гмін. Самаўрады.

(*працяг*).

Інструктары на пав. Нясьвіскі:

82) Мілішкевіч Антоні.	92) Есісі Базыль.
83) Шыбут Тодар.	93) Шэйка Якуб.
84) Ярош Янка.	94) Бобко Самуэль.
85) Пілецкі Янка.	95) Мікірэй Аляксанд.
86) Філіпчык Гальяш.	96) Дзямянюк Ігнат.
87) Янучок Аляксандар.	97) Чычка Дзеніс.
88) Забараўскі Язэп.	98) Чычка Тарас.
89) Гурын Алесь.	99) Плакса Пётра.
90) Пілецкі Адам.	100) Ціхон Рыгор.
91) Войцік Ігнат.	(*працяг будзе*)

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.